Сяргей Марозаў
Independent researcher, Belarus
banifacyj@mail.ru
ORCID: 0000-0002-7331-0785

POZNAŃSKIE STUDIA SLAWISTYCZNE
NR 27 (2024)
**DOI: 10.14746/pss.2024.27.8**

Data przesłania tekstu do redakcji: 14.02.2024
Data przyjęcia tekstu do druku: 8.11.2024

# Адукацыйна-культурна-рэлігійны асяродак Баруны як "месца памяці"

Abstract: Marozau Siarhei, *The Educational, cultural and religious centre of Baruny as a "place of memory"*, "Poznańskie Studia Slawistyczne" 27. Poznań 2024. Wydawnictwo "Poznańskie Studia Polonistyczne," Adam Mickiewicz University, Poznań, pp. 161–183. ISSN 2084-3011.

The article reveals the contribution of Baruny village (Grodno region) to the history of Belarusian education, Eastern European art and Christian religion of the 17th–20th centuries, as well as the modern representation of Baruny heritage in the historical memory of Belarus. It is traced how the appearance of the icon and the expansion of the cult of the Baruny Mother of God, as well as the construction of the temple in the 17th–18th centuries, determined the founding and development of the village, its current historical prestige and sacred status. The foundation in 1617 and the educational tradition of Baruny is described, in particular, the bright phenomenon of the secular Basilian school of the Enlightenment era. Baruny is shown as one of the centers of the historical Church Union in Belarus, which still exists today. The result was a justification for applying the definition of "place of memory" to Baruny, the list of actors "promoting" this memory, and the indication of the forms of its expression.

Keywords: Basilians; secular school; icon of God's Mother of Baruny; Uniate Church; historical memory; representation

This is an open access article licensed under the Creative Commons CC BY 4.0 License (https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/). © Copyright by the Author(s).

## Уводзіны

Сёння Баруны – гэта невялікая вёска ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці, з насельніцтвам 434 чалавекі (на 2019 год) і прыгожым будынкам касцёла ў цэнтры. Але гэта невялікае і непрыкметнае, на першы погляд, паселішча, якіх шмат у Беларусі, упісала яскравыя старонкі ў гісторыю беларускай адукацыі, усходнееўрапейскага мастацтва і хрысціянскай рэлігіі. Для беларускай інтэлігенцыі, арыентаванай на нацыянальныя гістарычныя і культурныя каштоўнасці, Баруны з'яўляюцца знакавым "месцам памяці". Яно матэрыялізавана ў старажытнай цудатворнай іконе – адной з самых шанаваных святынь, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі; у архітэктурным помніку высокай мастацкай вартасці з другой паловы XVIII ст. Гэта таксама сімвалічнае "месца памяці", звязанае з пачаткамі беларускай школьнай адукацыі, з адраджэннем пасля 150-гадовага небыцця Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы.

Відавочным з'яўляецца ўзмацненне па меры набліжэння да нашага часу навуковай і грамадскай цікавасці да адукацыйнай і сакральнай традыцыі Барунаў. Спадчыну мястэчка актуалізуюць гістарычныя юбілеі апошніх гадоў – 400-годдзе Барунскай школы, 330 гадоў з часу прызнання абраза Маці Божай Барунскай цудадзейным, 100-годдзе яго вяртання на Радзіму; 30-годдзе, як Баруны паклалі пачатак аднаўленню царкоўнай Уніі ў Беларусі.

Барунскія рарытэты і іх сучаснае "жыццё" – прадмет дадзенага артыкула. Ікона Барунскй Божай Маці, уніяцкі храм (цяпер касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла), базыльянская школа, адлік новага этапа гісторыі Брэсцкай царкоўнай Уніі ў Беларусі – усё гэта нас цікавіць не толькі як уласна гістарычны феномен, але таксама як рэпрэзентацыя артэфактаў эпохі Вялікага Княства Літоўскага – з іх фізічнымі характарыстыкамі і знакавым, сімвалічным зместам – у калектыўнай памяці народа і "бытаванне" ў сучасным беларускім сацыякультурным кантэксце.

Для вырашэння паўстаўленых задач выкарыстоўваюцца сістэмна-структурны і каштоўнасны падыходы, традыцыйныя метады даследавання (аналіз і сінтэз, гісторыка-генетычны, кампаратыўны,

рэтраспектыўны і інш.) і разгляд прадмета скрозь прызму сучаснай канцэпцыі "месцаў памяці".

## 1. Гістарыяграфія і крыніцы

Мястэчка Баруны прыцягнула да сябе "даследчыцкую" ўвагу ад самага пачатку свайго заснавання ў 1692 г. Гэта была спецыфічная цікавасць уніяцкіх царкоўных іерархаў, выкліканая пашырэннем пагаласкі пра цудадзейны "эфект" малітваў перад мясцовай іконай Божай Маці. Спачатку такія выпадкі, расказаныя пад прысягай, рэгістравала спецыяльная царкоўная камісія, высланая ў Баруны, і правяраў іх праўдзівасць мітрапаліт Кіпрыян Жахоўскі. Адзін з наступнікаў, протаархімандрыт (генерал) ордэна базыльянаў Леў Кішка ў 1712 г. выдаў у Супрасльскай базыльянскай друкарні кнігу "Morze Łask y szczodrobliwości Boskich w Puszczy Boruńskiey płynące to jest cuda Nayśw. Panny Boruńskiey w Borunach doznane", у якой апісаў 468 такіх цудаў. Такім чынам, ужо праз два дзесяцігоддзі пасля заснавання Баруны сталі прадметам спецыяльна прысвечанага яму, назавём так, краязнаўчага, царкоўна-статыстычнага даследавання (Kiszka, 1712). Перавыданне кнігі Льва Кішкі ў Супраслі ў 1742 г. і ў Мінску ў 2009 г. (Kiszka, 2009) сведчыць пра неаслабную ў стагоддзях цікавасць да беларускага гістарычнага брэнда пад назвай "Баруны". Для нас гэта праца з'яўляецца каштоўнай гістарычнай крыніцай як першае, матэрыялізаванае ў папяровым выданні, "месца памяці", звязанае з мястэчкам.

Уласна навуковая цікавасць да Барунаў і яго рэліквій з'явілася ў другой палове XIX ст., калі мястэчка пападае на старонкі энцыклапедый і гістарычных даследаванняў.

1907 годам датуецца другая, вядомая навуцы, спецыяльная даследчая праца пра Баруны аўтарства праваслаўнага святара Міхаіла Пашкевіча (Пашкевич, 1907). Яе пераклад у 1981 г. у мікраформу, а ў 2013 г. – у цыфравы рэсурс, зноў-такі, з'яўляецца сведчаннем краязнаўчай, канфесійнай, навуковай запатрабаванасці на веды пра мястэчка і яго святыні ў гістарычнай памяці пакаленняў.

Абуджэнне гэтай памяці назіраецца ў суверэннай Беларусі на хвалі пераасэнсавання беларускай навукай і грамадствам мінулага

сваёй краіны і фарміравання нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі. Першай ластаўкай стаў газетны артыкул “Баруны” беларускага паэта, краязнаўца, настаўніка і праваслаўнага святара, рэпрэсіраванага савецкай уладай, Пятро Бітэля (1912–1991), які ў 1920-я г. вучыўся ў Барунах, а пасля вайны настаўнічаў у суседняй вёсцы Вішнева (Бітэль, 1991).

Услед за П. Бітэлем навуковую памяць пра гістарычную ўнікальнасць Барунскага культурна-асветніцкага асяродка ўзбагаціла С. В. Палуцкая. У 1995 г. яна выступіла з артыкулам, грунтаваным на архіўных і апублікаваных крыніцах, “Барунская базыльянская школа і яе выхаванцы” (Палуцкая, 1995), пазней у розных версіях перадрукаваным (Марозава, 2014).

З 1990-х г. Барунская школа ўвайшла ў даследчае поле гісторыка адукацыі Андрэя Самусіка (Самусік, 1998), храм – у поле зроку гісторыкаў архітэктуры віленскага барока Анатоля Кулагіна і Тамары Габрусь.

Але сапраўдны бум навуковай, а таксама турыстычнай, краязнаўчай, канфесійнай, медыйнай цікавасці да Барунаў і яго рэліквій пачаўся з другой паловы 2000-х г., калі Вялікае Княства Літоўскае, у якім бярэ свой пачатак слава Барунаў, стала ўваходзіць у афіцыйны беларускі гістарычны наратыў. Адной з першых на гэтым шляху была Міжнародная навуковая канферэнцыя ў мястэчку Гальшаны (Ашмянскі раён) у 2006 г. “Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына”. У яе матэрыялах Аляксандр Доўнар упершыню надрукаваў прывілей на магдэбургскае права Барунам 1705 г. (Доўнар, 2007).

Значнай для гістарыяграфіі тэмы стала брашура барунскага ксяндза Люцыяна Дамброўскага “Санктуарыум Маці Божай Барунскай” (Дамброўскі, 2007).

У другой палове 2010-х – 2020-я г. да Барунскай праблематыкі звяртаецца ў кантэксце сваіх навуковых інтарэсаў цэлая група беларускіх даследчыкаў. Мастацтвазнаўцы Аляксандр Ярашэвіч (Ярашэвіч, 2015) і Станіслаў Чавус вывучаюць іканаграфію барунскага абраза Маці Божай (Чавус, 2020а; Чавус, 2020б), Галіна Флікоп-Світа – іканаграфію ўніяцкіх храмаў Беларусі. Гісторык Сяргей Стрэнкоўскі ахарактарызаваў асаблівасці магдэбургскага самакіравання мястэчка Баруны (Стрэнкоўскі, 2016). Гісторык Андрэй

Шпунт – аўтар нарыса пра першага ўласніка барунскага абраза, манаха Язафата Бражыца, якія пакінуў значны след у гісторыі беларускіх базыльян (Шпунт, 2023).

Культ Маці Божай і цудатворныя абразы ў Вялікім Княстве Літоўскім вывучае шэраг польскіх даследчыкаў, з якіх артыкул пра Барунскі абраз належыць Пятру Хоміку (Chomik, 2003). Гісторыю санктуарыя і базыльянскай навучальнай установы ў Барунах даследавала Дарота Вэрэда, якая асаблівую ўвагу ўдзяліла характарыстыцы педагагічных кадраў і матэрыяльнай базы школы (вучэбныя памяшканні, бібліятэка, падручнікі, музычныя інструменты) у канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст. (Wereda, 2006).

Сярод гістарычных крыніц, выкарыстаных у дадзеным даследаванні, – літаратурныя і публіцыстычныя творы, мемуарыстыка, перыядычны друк. Гэта згаданая праца Льва Кішкі (1712 г.) з апісаннем дзівосаў, звязаных з абразом Маці Божай. Пакінулі мемуары пра школу ў Барунах, яе парадкі і сваю вучобу ў ёй у 1800-я – 1810-я г. Ігнат Ходзька (Chodźko, 1925), Антон Адынец (Адынец, 2020). Пётр Бітэль выклаў успаміны пра сваё навучанне ў 1920-я г. у вершаванай паэме “Баруны” 1979 г. (Бітэль, 1990). Газета “Наша думка” за 18 сакавіка 1921 г. расказала пра пачатак дзейнасці ў Барунах Беларускай настаўніцкай семінарыі і цяжкасці, з якімі ёй давялося сутыкнуцца (Правінцыйны аддзел. Баруны, 1921, 5). Публікацыі на старонках сучаснай перыёдыкі педагогаў, краяведаў, журналістаў Ашмяншчыны, а таксама матэрыялы сайтаў культавых устаноў, найперш, Catholic.by, адлюстроўваюць працэс выкарыстання гісторыі і спадчыны Барунаў у наш час і іх уключанасць у духоўна-рэлігійны і культурна-адукацыйны кантэкст жыцця краю.

## 2. Сціплы абраз вялікай духоўнай сілы

Сэрцам Барунаў з’яўляецца абраз Маці Божай Барунскай, які паходзіць з другой паловы XVII ст. Звычайны і сціплы, на першы погляд, невялікі памерам твор на дошцы (42 × 60 см) работы невядомага мастака валодае вялікай духоўнай сілай – ужо 330 гадоў ён шануецца як цудадзейны і прыцягвае ў Баруны тысячы людзей.

У хрысціянскай традыцыі культу маці Ісуса Хрыста належыць асаблівае месца. Яна прызнаецца магутнай заступніцай вернікаў; ёй прысвячаюцца шматлікія санктуарыі, абразы, статуі. Падставай для шанавання абраза як цудатворнага становяцца засведчаныя духоўнымі ўладамі выпадкі "цудоўнай дапамогі" па малітвах перад ім – ад выздараўлення смяротна хворых людзей да выратавання цэлых населеных пунктаў ад іншаземных захопнікаў.

Першае ўпамінанне пра абраз Маці Божай Барунскай сведчыць пра тое, што ён з'яўляўся ўласнасцю базыльяніна Язафата Бражыца (1635–1683), настаяцеля кляштараў у Мінску, потым у Полацку і Віцебску. На сваіх жыццёвых шляхах ён заўсёды меў абраз пры сабе, а перад смерцю перадаў сваяку Мікалаю Песляку з фальварка Казякоўшчына з просьбай берагчы і шанаваць як каштоўны скарб. Той загарнуў абраз у тканіну і схаваў ў скрыню, а сам наступныя пяць гадоў служыў у іншым маёнтку. Цяжкая хвароба ў 1691 г. прымусіла Мікалая ўспомніць запавет пабожнага базыльяніна, калі вобраз Маці Божай з падаранага абраза ўявіўся хвораму. Яна звярнулася да Песляка "рускімі словамі", чаму не паклапаціўся пра годнае для яе месца. Апрытомнеўшы, спадкаёмца Язафата Бражыца ўсталяваў крыж, змясціў на ім абраз і задумаў пабудаваць для яго драўляную царкву.

Як сведчаць царкоўныя крыніцы, дапамога яму ад Маці Божай адчувался ад самага пачатку. Пасля таго, як па наваколлі разнеслася чутка, што сляпы, які праходзіў міма абраза, пачаў бачыць і падняў цвік, што згубіўся пры ўсталяванні абраза на крыжы, у Баруны пачалі прыходзіць людзі з малітвамі і просьбамі. Усе, хто з верай звяртаўся да іконы, адыходзілі, паводле народнай пагаласкі, суцешаныя і шчаслівыя. Іх ахвяраванні ў скарбонцы, змешчанай ля крыжа, дазволілі Мікалаю Песляку пачаць пабудову драўлянай уніяцкай цэркаўкі. Ён узвёў яе на тым месцы, якое падчас відзення ўказала Божая Маці, – лясны бор ля развілкі дарог на Гальшаны і Вільню – і якое называлася Барунамі. У 1692 г. абраз ўрачыста ўнеслі ў новазбудаваную святыню.

Каб праверыць праўдзівасць цудаў, у ліпені 1692 года кіеўскі ўніяцкі мітрапаліт Кіпрыян Жахоўскі накіраваў у Баруны царкоўную камісію. Да канца студзеня 1693 г. яна занатавала 72 цудоўныя



Іл. 1. Ікона Маці Божай Барунскай. XVII ст.




Іл. 2. Язафат Бражыц. Гравюра 1680 г. Гравёр – Аляксандр Тарасевіч

падзеі, пра якія пад прысягай сведчылі вернікі і духавенства: выратаванне жыцця, вяртанне з няволі, навяртанне закаранелых грэшнікаў, выздараўленне і інш. Мітрапаліт асабіста прыехаў у Баруны разглядзець вынікі даследванняў. 2 лютага 1693 года ён выдаў дакумент аб прызнанні абраза Маці Божай Барунскай цудадзейным, а цудаў – праўдзівымі (Chomik, 2003, 121–123).

Мітрапаліт загадаў Мікалаю Песляку пабудаваць новую царкву – мураваную, пасвяціў яго ў духоўны сан і прыслаў з Вільні на дапамогу двух манахаў-базыльян. Землеўласнікі выдзелілі зямлю для будучага манастыра і новастворанага паселішча Баруны, якое пачало хутка засяляцца. Па сведчанню царкоўных крыніц, 1693–1694 гады таксама былі насычаныя цудоўнымі падзеямі, звязанымі з Барунскай іконай. Шырылася яе слава як суцяшальніцы засмучаных (Chomik, 2003, 130). У 1695 г. у Мікалая Песляка было дастаткова грошай, каб пабудаваць мураваную царкву, аднак смерць не дазволіла завяршыць пачатую справу. Узвядзенне ў Барунах новай царквы датуюць 1699 (1707) г.

Нашчадак Мікалая – Ян Пясляк, абвінавачаны базыльянамі ў марнатраўстве і прычыненні вялікай фінансавай шкоды манастыру, пастановай Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага 1702 г. пазбавіўся статуса патрона кляштара, які разам з паселішчам Баруны быў перададзены ва ўласнасць базыльян. Ахвярай Яна Песляка стала і цудатворная ікона, якая пазбавілася прысвоеных ім залатой кароны, усыпанай пярлінамі, залатых ланцужкоў, пярсцёнкаў, дыяментавых крыжоў, пярлінавых караляў.

У Паўночную вайну, перад пагрозай шведскага нашэсця, базыльяне ў 1702 г перадалі цудадзейны абраз у Валожын гетману Вялікага Княства Літоўскага Міхалу Вішнявецкаму. Да 1709 г. абраз пад апекай трох барунскіх манахаў вандраваў разам з войскам. Там, дзе яно разбівала свой лагер на пастой – у Валожыне, Брэсце, Пінску, Жамойці (Літва), базыльяне адпраўлялі набажэнствы, а мясцовыя жыхары грамадзіліся ля абраза Маці Божай, якой давяралі свае патрэбы.

У 1705 г. разбудаваная вёска атрымала магдэбургскае права і статус мястэчка (Доўнар, 2007). Магдэбургія ў Барунах была рэальна ўсталявана і дзейнічала на самой справе. Інстытутамі гарадской улады былі войт, радца і пісар. Судовая ўлада была даверана кіраўніку базыльянскага кляштара. Па прычыне невялікай колькасці насельніцтва структура органаў гарадскога самакіравання ў мястэчку была спрошчанай (Стрэнкоўскі, 2016).

14 мая 1707 г. вялікі пажар знішчыў Баруны, кляштар і часткова царкву. Паступова яны адбудоўваліся. У 1709 г. дахаты вярнуўся абраз. Апелюючы да яго, ашмянская шляхта дамагалася ад сейма Рэчы Паспалітай 1710 г. матэрыяльнага забеспячэння Барунскага манастыра.

Падчас эпідэміі, якая ў 1710–1711 г. ахапіла Вялікае Княства Літоўскае, Барунская ікона лічылася асаблівай абаронцай хворых. Пакланіцца ёй прыходзіла шмат людзей, якія прагнулі выздараўлення. Факты выздараўлення дадавалі ўсё больш славы гэтаму месцу.

Цуды, якія адбываліся ў Барунах перад аблiччам Маці Божай з вернікамі з розных куткоў Вялікага Княства Літоўскага, запісаў кіраўнік базыльянскага ордэна Леў Кішка. Усяго зафіксаваў 468 такіх выпадкаў. Ён прысвяціў ім кнігу «Мора ласкаў і шчадротаў Боскіх

у пушчы Барунскай дазнаных...», якую выдаў у 1712 г. у базыльянскай друкарні ў Супраслі (Kiszka, 1712; Chomik, 2003, 130).

Колькасць паломнікаў у культавы цэнтр цудатворнага абраза значна ўзрасла ў мірны час. У 1715 г. царква і манастыр былі адбудаваны па фундацыі ўніяцкага мітрапаліта Льва Кішкі (1714–1728). Павялічылся іх фінансаванне спадчыннікамі Мікалая Песляка і мясцовай шляхтай. Гэта дазволіла пашырыць манастыр і царкву ў Барунах. У 1747–1757 г. па праекту архітэктара Аляксандра Асікевіча тут быў узведзены новы храм у стылі барока. У 1778–1793 г. пабудавалі мураваны манастырскі корпус. У ім размясцілася базыльянская школа. Выява Маці Божай Барунскай была тады адной з самых вядомых у Вялікім Княстве Літоўскім (нароўні з Жыровіцкай). Звесткі пра цудадзействы, з ёй звязаныя, фіксаваліся і ў другой палове XVIII ст.

У пачатку XIX ст. уніяцкі абраз Божай Маці Барунскай быў адным з самых шанаваных на Віленшчыне і Гродзеншчыне. Адам Міцкевіч згадваў пра яго ў двух сваіх творах: "Aniela" і "Nocleg".

У 1833 г. базыльяне ў прадбачанні забароны царскай уладай свайго ордэна і закрыцця кляштара, перадалі абраз сям'і Важынскіх (Важыцкіх) з суседняй вёскі Аляны, а ў царкве змясцілі яго дакладную копію. Разам са сваімі новымі апекунамі абраз вандраваў па розных гарадах: Кракаў, Закапанэ, Вільня. У памяць пра тую вандроўку ў касцёле горада Закапанэ (Кракаўская архідыяцэзія), знаходзіцца абраз з надпісам: «Цудоўная Маці Божая з пушчы Барунскай». Гэта твор Крыстыны Судзілоўскай з Наваградчыны, чые продкі некалькімі пакаленнямі захоўвалі цудатворны арыгінал (Калевіч, 1991).

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 г. расійскія ўлады перадалі Барунскі базыльянскі кляштар і царкву ў праваслаўнае ведамства. Тут дзейнічаў праваслаўны манастыр і прыход. Праўда, як вынікае з выдання "Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich", слава Барунаў засталася ў мінулым, а на 1880 год гэта было заняпалае беднае мястэчка на 45 дамоў і 155 жыхароў з некалькімі корчмамі (Boruny,1880). У 1899 г. у сувязі з высокім коштам утрымання праваслаўны манастыр быў закрыты, а ў 1915 г. праваслаўнае духавенства і наогул пакінула Баруны.

У 1919 г. Барунская царква і манастыр былі перададзены Каталіцкаму Касцёлу. Тут заснавалі рыма-каталіцкую парафію Святых

Апосталаў Пятра і Паўла, якая існуе і сёння. У 1922 г. дадому вярнуўся пасля працяглай вымушанай вандроўкі, якая доўжылася больш за 80 гадоў, абраз Маці Божай Барунскай і быў змешчаны на ранейшым месцы. І сёння ў касцёле знаходзіцца арыгінал цудатворнага абраза, які ўніяцкія манахі вывезлі з Барунаў у момант ліквідацыі іх кляштара. Абраз зноў вярнуўся ў храм у 1992 г., адноўлены пасля заканчэння эпохі атэістычнага бязбожжа.

Абраз, які сёння знаходзіцца ў храме Святых Пятра і Паўла ў Барунах, – адна з самых шанаваных хрысціянскіх святынь Беларусі. Яна ўшаноўваецца пад тытулам Маці Божай Суцяшальніцы Засмучаных. Барунскі касцёл здаўна з'яўляецца адным з цэнтраў культу Маці Божай у Беларусі і месцам паломніцтва. У 1990 г. тут з удзелам шматлікага духавенства і вернікаў адбылося святкаванне 300-годдзя культу Маці Божай Барунскай. У 2002 г. храм у Барунах атрымаў статус санктуарыя – месца захавання (знаходжання) багатай рэлігійнай, духоўна-культурнай і матэрыяльнай спадчына Касцёла і народа і месца шанавання цудатворнага абраза.

У 2017 г. папулярная краязнаўчая відэаперадача "Падарожжа дылетанта" прысвяціла Барунам свой чарговы выпуск. Вядучы перадачы Юры Жыгамонт расказаў пра тое, як лясная вёсачка стала шумлівым мястэчкам і адным з цэнтраў грэка-каталіцтва ў Беларусі ("Падарожжа дылетанта", 2017).

Апошнія гады адбываецца ўключэнне абраза Божай Маці Барунскай у больш шырокі беларускі культурны кантэкст. З 2021 г. яго копія работы мастачкі Ядвігі Сенько з Маладзечна раз у год падарожнічае па каталіцкіх прыходах краіны разам з копіямі 16 іншых беларускіх цудадзейных абразоў Маці Божай, культ якіх з даўніх часоў пашыраны ў Беларусі і якія знаходзяцца на яе тэрыторыі. Усе гэтыя цудатворныя абразы датаваны XVII ст. Сярод мэтаў пілігрымкі – з'яднанне беларускага народа. Рэпрэзентацыі сакральнай спадчыны Барунаў паспрыялі гістарычныя юбілеі, якія прыйшліся на 2022–2023 гады: 100-годдзе вяртання ў 1922 г. славутага абраза; і 330-годдзе з таго часу, як абраз Маці Божай Барунскай быў прызнаны ў 1693 г. цудадзейным. Падчас святкаванняў прагучалі словы аўтарытэтных царкоўных іерархаў пра ператварэнне Барунскага санктуарыя ў апошнія тры дзесяцігоддзі – з часу, калі пачаўся працэс

яго адраджэння, ва ўсё больш вядомае месца марыйнага культу і месца “надзеі, якую людзі ўскладаюць на Марыю ў наш складаны час з яго маральнымі і грамадскімі паталогіямі” (У Барунах, 2022); і пра рашэнне каранаваць абраз у знак удзячнасці Божай Маці Барунскай “за багатую і цудоўную гісторыю Яе прысутнасці ў гэтым санктуарыі” (Падчас урачыстасці, 2023). Урачыстасць каранацыі адбылася ў кастрычніку 2024 г.

## 3. Архітэктурны помнік высокай мастацкай вартасці

Вялікі мураваны касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла, які ўзвышаецца ў цэнтры Барунаў, быў узведзены на месцы храма пабудовы 1692 г. у 1747–1757 г. як уніяцкая царква па праекце і пад кіраўніцтвам манаха Барунскага базыльянская манастыра, архітэктара Аляксандра Асікевіча. Інтэр’еры афармляліся да 1770 г. Іх выконваў разьбяр Фрэдэрык Квячур.

Храм у Барунах з’яўляецца адным з найбольш дасканалых твораў віленскага (уніяцкага) барока, які ў 30–80-я г. XVIII ст. атрымаў папулярнасць у храмавай архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага. Створаны на аснове творчага сінтэзу візантыйскага, заходнееўрапейскага мастацтва і традыцый мясцовага дойлідства, ён набыў яскравую нацыянальную адметнасць. Таму яго яшчэ называюць “познае беларускае барока”. Помнікі гэтага стылю вылучаюцца дынамізмам, лёгкасцю, свабодай.

Гэтыя рысы яскрава выявіліся ў архітэктурным творы Аляксандра Асікевіча, які накіраваў увагу на стварэнне выразнага мастацкага аблічча галоўнага фасада. Шэраг незвычайных архітэктурных рашэнняў надаюць вонкаваму абліччу храма веліч і хараство. У яго архітэктуры няма сіметрыі, так уласцівай для культавага будаўніцтва. Будынку храма ўласцівыя вытанчанасць і вертыкалізм прапорцый, скульптурная пластычнасць фасада і інтэр’ера, маляўнічасць, складанасць сілуэта і стройнасць, якія надаюць збудаванню шмат’ярусныя вежы, фігурныя франтоны і хвалісты галоўны фасад.

Храм у Барунах – гэта архітэктурны помнік высокай мастацкай вартасці. У наш час ён быў цалкам адрэстаўраваны і з’яўляецца

гісторыка-культурнай каштоўнасцю і славутасцю Беларусі. Помнікамі, выкананымі ў стылі віленскага барока, Беларусь увайшла ў гісторыю еўрапейскай архітэктуры.

Уяўленне пра выгляд царквы ў хуткім часе пасля пабудовы, а таксама цэнтра мястэчка Баруны дае іх замалёўка з натуры, якую ў 1879 г. зрабіў мастак Напалеон Орда. Сёння фатографы вядуць высокароднае спаборніцтва, хто з іх лепш, прыгажэй, арыгінальней адлюструе храм у сваім творы.

За касцёлам захаваўся двухпавярховы мураваны манастырскі будынак, узведзены побач з ім у 1778–1793 г. Ён таксама з'яўляецца гістарычнай славутасцю Беларусі як адукацыйны асяродак, хоць сёння не выкарыстоўваецца, і патрабуе грунтоўнай рэканструкцыі. Амаль дзве сотні гадоў, да 1979 г., тут размяшчалася навучальная ўстанова – спачатку базыльянская гімназія, затым праваслаўная духоўная школа, царкоўна-прыходскае вучылішча, беларуская настаўніцкая семінарыя, народнае вучылішча. У розныя часы тут навучалася ад 140 да 200 юнакоў. Пасля 1939 г. працавала савецкая школа. Рэстаўрацыя гэтага будынка, на жаль, не плануецца.

## 4. Школа з беларускай кнігі рэкордаў Гінэса

Сёння дзве навучальныя ўстановы дзеляць тытул «самай старой дзеючай школы Беларусі». Адна з іх – школа ў Барунах. У 2017 г. яна адзначыла свой 400-ты дзень нараджэння. За гэты час яна перажыла розныя ўлады і гістарычныя эпохі, зведала шмат перайменаванняў, зменаў фармату і сістэм навучання, пераездаў і рамонтаў. Шмат пакаленняў вучняў і настаўнікаў прайшлі праз гэту школу (Козел, 2018).

Першымі асвету прынеслі ў Баруны манахі базыльянскага ордэна, які быў заснаваны (рэарганізаваны) у 1617 г. кіеўскім уніяцкім мітрапалітам Іосіфам Руцкім. З самага пачатку базыльяне праявілі вялікую актыўнасць у сферы адукацыі. Сярод першых адкрытых імі навучальных устаноў была пачатковая школа для манахаў і святароў у Барунах, якую заснавалі ў 1617 г. Яна гадавала новую генерацыю духавенства, якое ўмацоўвала Уніяцкую Царкву і ўздымала яе прэстыж.



Іл. 3. Напалеон Орда, Баруны Рынак Базыльянскі, 1879



Іл. 4. Баруны. Касцёл Святых Апосталаў Пятра і Паўла (сучасны выгляд). Фота аўтара.

Спусташальная вайна, якая пракацілíся па беларускіх землях ў 1654–1667 г., амаль дашчэнту знішчыла базыльянскае школьніцтва. Працэс яго адраджэння зацягнуўся на дзесяцігоддзі. Школа ў Барунах зноў пачала працу ў 1700 г., калі сюды перавялі з мястэчка Вішнева разам з маёмасцю і настаўнікамі трохгадовую базыльянскую школу свецкага напрамку. У 1740–1780 г. яна па патрабаванні клерыкалаў, змяніўшы сваю праграму, рыхтавала кандыдатаў у духоўнае званне.

Новы этап адукацыйнай актыўнасці базыльян прыпадае на апошнюю чвэрць XVIII – першую трэць XIX ст., эпоху Асветніцтва. Даследчыкі налічваюць "на Літве і Русі" 22 базыльянскія школы (сярэднія і павышанага тыпу), якія дзейнічалі ў 1770-я – 1790-я г. пад патранатам Адукацыйнай камісіі (Марозава, Марозаў, 2023, 60). Яскравай з'явай гісторыі адукацыі Беларусі, Усходняй Еўропы сталі свецкія школы (вучылішчы), якія ўтрымліваліся ордэнам, працавалі па праграмах і статуту Адукацыйнай камісіі і рыхтавалі моладзь да дзяржаўнай службы. Такой была школа ў Барунах, якая ў 1780 г. зноў стала свецкай і ператварылася ў шасцігадовую. Яна размяшчалася ў асобным драўляным будынку. У 1793 г., калі завяршылася будаўніцтва манастырскага корпуса, у ім размясціліся школьныя класы і кватэры для настаўнікаў. Вучні жылі ў дамах мяшчан і знаходзіліся пад наглядам гувернёраў. У XIX ст. у Барунскай школе займалася да 200 юнакоў ва ўзросце ад 9 да 18 гадоў, пераважна сыноў шляхты з Ашмянскага і суседніх паветаў (Адынец, 2020, 46–48). Баруны ў гэты перыяд з'яўляліся буйным асветніцкім асяродкам Уніі.

Зместам навучання і распарадкам Барунская школа не адрознівалася ад свецкіх школ, "хіба што толькі духоўны сан настаўнікаў надаваў іх паводзінам, і паслушэнству вучняў, і нават самой навуцы арэол рэлігійнага служэння". Педагагічны калектыў складаўся з шасці прафесараў (выкладчыкаў) з прэфектам на чале. Усе яны ў свой час атрымалі адукацыю ў Віленскім універсітэце. Выкладалі арыфметыку, матэматыку, фізіку, геаграфію, батаніку, права, эканоміку, Святое пісанне, сельскую гаспадарку, красамоўства, латынь, французскую, нямецкую мовы (Адынец, 2020, 46, 51). Давалі веды па гісторыі Радзімы. Выкладанне мела патрыятычную скіраванасць.

Барунская школа давала аб'ём ведаў, неабходны для паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову. Найбольш здольныя да навукі выпускнікі працягвалі вучобу ў Віленскім універсітэце. Высокая якасць выхавання ў манастырскіх школах забяспечвала ўніверсітэт самымі стараннымі і высокамаральнымі студэнтамі, якія потым папаўнялі шэрагі мясцовай інтэлігенцыі. Паэт Уладзіслаў Сыракомля ахарактарызаваў базыльянскія школы так:

> Нашых дзядоў сцябалі старыя езуіты, нашых бацькоў секлі айцы піяры, а мы паспыталі базыльянскія розгі. Але няхай за гэтыя розгі ўшануюць іх нябёсы. Так здорава яны лупцавалі, калі было за што, але і любілі яны дзяцей сардэчна і шчыра, старанна настаўлялі іх у навуцы і веры і строга пільнавалі мараль – шмат каго дала нашаму краю іх уважлівая апека (Самусік, 1998, 45).

Барунская базыльянская школа ўжо ў XIX ст. стала знакамітай дзякуючы сваім выпускнікам, якія пакінулі выдатны след у навуцы, культуры і грамадскім жыцці Беларусі, Літвы, Польшчы. Сярод іх пісьменнікі Антон Адынец, сябар Адама Міцкевіча, і Ігнат Ходзька; паэт, перакладчык Юльян Корсак; гісторык, публіцыст Леанард Ходзька. На схіле жыцця хвалюючыя ўспаміны пра школьныя парадкі, гістарычныя асобы, звязаныя з Барунамі, і сваё школьнае жыццё напісалі Ігнат Ходька, які вучыўся ў 1804–1810 г. (Chodźko, 1925), і Антон Адынец (Адынец, 2020), барунскі студэнт у 1813–1820 г. Антоні Вырвіч стаў прафесарам матэматыкі, а Вінцэнт Карчэўскі – ад'юнктам (памочнікам прафесара астраноміі) Віленскага ўніверсітэта. Антон Камінскі быў аўтарам работ па асновам геаграфіі і матэматыкі. Многія з выпускнікоў занялі высокія пасады ў органах дзяржаўнай улады і мясцовага кіравання (Адынец, 2020, 48), у царкоўнай іерархіі.

Але ў 1830-я г. базыльяне, якія да нядаўняга часу з'яўляліся магутным рухавіком асветніцтва ў Беларусі, былі поўнасцю выцеснены са сферы адукацыі. Яны не апраўдалі надзеі царызма на выхаванне прасякнутага вернападданіцкімі настроямі маладога пакалення. Вучонае манаства, наадварот, паралізоўвала намаганні ўраду па ўнутраным зліцці краю з імперыяй, прышчэплівала ўніяцкай

моладзі ліцвінскі сепаратызм і мясцовы патрыятызм і тым узмацняла апазіцыйныя настроі. З разгромам базыльянскай сістэмы свецкай адукацыі школа ў Барунах у 1835 г. была ліквідавана. Замест яе і на яе базе была створана духоўная школа на 20 чалавек – сірот або дзяцей беднага духавенства. У 1884 г. у мястэчку пачала дзейнічаць царкоўнапрыходская школа. У ёй было 28 вучняў.

У 1920–1922 г. у манастырскім будынку працавала Беларуская настаўніцкая семінарыя. Яе дырэктарам і настаўнікам быў грамадска-палітычны дзеяч, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху Сымон Рак-Міхайлоўскі. 20 лютага 1921 г. у Барунах пачалі навучанне 58 падлеткаў з Ашмяншчыны (42 хлопчыкі і 16 дзяўчынак), якія прайшлі ўступныя экзамены. У залежнасці ад ўзроўню падрыхтоўкі іх падзялілі на два класы. Выкладалі беларускую, польскую, нямецкую мовы, арыфметыку, геаметрыю, геаграфію, рымска-каталіцкую рэлігію, спевы, гімнастыку. Выкладанне вялося на роднай мове вучняў – беларускай. Карысталіся падручнікамі, друкаванымі лацінкай. Пры семінарыі арганізавалі інтэрнат на 35 чалавек і агульную кухню з прадуктаў ад бацькоў "і з амерыканскіх дароў". Дзякуючы энергіі дырэктара і настаўнікаў, нягледзячы на дарагоўлю, недахоп патрэбных грошай і матэрыялаў, хутка зрабілі неабходны рамонт запушчанага і знішчанага падчас вайны манастырскага будынку. Вучні прымалі ўдзел у ачыстцы яго, забруджанага падчас побыту войска. Насельніцтва навакольных вёсак сімпатызавала дырэктару школу – "ідэолагу супольнага згоднага жыцця беларускай і польскай люднасці" і семінарыі. Але ад самага пачатку агітацыю супраць беларускай семінарыі разгарнулі некалькі "артадоксаў польскай эндэцыі" з Барунаў. Пры падтрымцы мясцовых абшарнікаў яны арганізавалі падачу ўладам калектыўнай петыцыі аб закрыцці семінарыі ці пераводзе яе ў іншае месца. Мясцовых жыхароў-католікаў яны запужвалі, што паколькі ў семінарыю прымаюцца праваслаўныя беларусы (большую частку семінарыстаў, аднак, складалі рыма-католікі), дык потым яна можа адабраць касцёл і зноў перавярнуць яго на царкву (Правінцыйны аддзел. Баруны, 1921, 5).

На змену беларускай у 1922 г. прыйшла польская настаўніцкая семінарыя. У ёй выкладаў Тамаш Багушэвіч – сын класіка беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча. Тут рыхтавалі моцныя настаў-

ніцкія кадры. Пра гэта – радкі паэмы “Баруны” яе выпускніка Пятро Бітэля:

Скажу пра нашу школу смела,
Што многа нам яна дала,
І што выхоўваць для сяла
Яна настаўнікаў умела.
З Барунскай школы педагог
Умеў рабіць адзін за трох (Бітэль, 1990, 185).

У 1933 г. Барунская школа стала сямігадовай, у 1955 г. атрымала статус сярэдняй, у 2022 г. – пасля шэрагу рэарганізацый – гэты статус аднавіла. У 1980 г. яна пераехала ў новы трохпавярховы будынак. Вучняў тут сёння менш, чым у XVIII ст. Але школа, можна сказаць, трапіла ў беларускую Кнігу рэкордаў Гінэса як адна з найстарэйшых навучальных установаў краіны, дзеючых да нашага часу. Нагадвае пра гэта Алея Асветніцтва, якую ў 2017 г. вучні пасадзілі ля муроў будынка базыльянскага кляштара ў гонар 400-годдзя развіцця адукацыі ў Барунах (Бражыцкая, 2017).

## 5. Знакавае месца ў навейшай гісторыі Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы

Сёння катэгорыі “гістарычная памяць”, “месцы памяці”, “гістарычная палітыка” адносяцца да ліку найбольш запатрабаваных у гуманітарнай сферы. Гістарычнай памяці як сукупнасці ведаў і ўяўленняў аб мінулым уласцівыя эмацыйнасць успамінаў і іх выбарачнасць – яна акцэнтуе ўвагу на падзеях і асобах мінулага, значных і актуальных для сучаснасці, для патрэбаў цяперашняга часу. Гістарычная памяць выяўляецца ў захаванні і ўзнаўленні мінулага досведу, азнаменаванні памятных дат. Уяўленні грамадства аб сваёй гісторыі, успаміны пра мінулае канцэнтруюцца ў “месцах памяці”. Гэта не толькі фізічнае, геаграфічнае месца, але і сімвалічнае. Яно ўвасабляе ў сабе адзінства духоўнага і матэрыяльнага. Усе гэтыя дэфініцыі ў роўнай меры адносяцца і для Барунаў.

Баруны – гэта геаграфічная кропка з асаблівай сімвалічнай аўрай – аўрай святасці і шанавання. Гісторыя часоў Вялікага Княства Літоўскага пакінула ў Барунах свае бачныя і нябачныя сляды: твор сакральнага жывапісу канца XVII ст. з прызнанай Царквой цудадзейнай моцай; адметны архітэктурай віленскага барока ўніяцкі храм сярэдзіны XVIII ст., які ў наш час атрымаў статус санктуарыя і становіцца ўсё больш вядомым месцам марыйнага культу; інтэр'ер храма другой паловы XVIII ст., які адзіны ў Беларусі найлепш захаваў аўтэнтычнае аблічча з часоў Уніі; 400-гадовая школьная традыцыя, знакамітая базыльянскай школай для свецкай моладзі, заснаванай у эпоху Асветніцтва, і Беларускай настаўніцкай семінарыяй пачатку 1920-х г.; урэшце, вобраз думак і пачуццяў людзей, а таксама рытуалы і звычаі, якія трымаюцца на больш старажытных пластах. Ужо сама назва населенага пункта выклікае ўстойлівую асацыяцыю з царкоўнай Уніяй 1596–1839 г. Баруны – гэта адзін з гістарычных цэнтраў Уніі ў Беларусі і яе асабліва шанаванае "месца памяці". Але і ў навейшую гісторыю Уніі Баруны ўвайшлі як месца, дзе рэальныя абрысы набыла ідэя адраджэння Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы.

У 1979–1990 г. святаром у Барунскім касцёле Святых Пятра і Паўла служыў беларускі рэлігійны і грамадскі дзеяч Ян Матусевіч. З 1988 г. ён, будучы сябрам праўлення Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, адным з першых у БССР стаў праводзіць набажэнствы на беларускай мове. Пры ім Баруны сталі месцам паломніцтва інтэлігенцыі з усёй Беларусі, сярод якой ва ўмовах лібералізацыі грамадскага і рэлігійнага жыцця з'явілася імкненне да аднаўлення легальнай дзейнасці Уніяцкай Царквы. Ян Матусевіч хрысціў многіх маладых людзей, якія прыйшлі да ўсведамлення сваіх уніяцкіх каранёў.

12 лістапада 1989 г. у Барунах адзначаўся дзень памяці Святога Язафата Кунцэвіча. У багаслужэнні (па лацінскім абрадзе) прыняла ўдзел група моладзі і інтэлігенцыі з Мінска. Гэта мерапрыемства з'яўляецца першай публічнай акцыяй грэка-католікаў у Беларусі. У пачатку 1990 г. гэтыя маладыя людзі заснавалі студэнцкае аб'яднанне "Унія", у 1990–1991 г. выдавалі першы грэка-каталіцкі часопіс "Унія". Пачалося стварэнне першых абшчын вернікаў-уніятаў. У іх памяці Баруны і Унія абавязаны перадусім двум грэка-каталіцкім святарам: легендарнаму базыльяніну Язафату Бражыцу і Яну Ма-

тусевічу, які ў канцы XX ст. спрычыніўся да адраджэння царкоўнай Уніі ў Беларусі, знішчанай царызмам у 1839 г. Абодва паходзяць з Мінска. Таму менавіта мінскія грэка-католікі 15 кастрычніка 2017 г. выправіліся ў пілігрымку ў Баруны, каб адзначыць 95-годдзе вяртання сюды ў 1922 г. іконы Маці Божай. 9 лістапада 2019 г. ужо вернікі і грэка-каталіцкае духавенства з Мінска, Гродна, Маладзечна, Івацэвічаў урачыста адзначылі ў Барунах 30 гадоў з часу, калі тут адбылося тое набажэнства 1989 г., якое паклала пачатак адраджэнню ўніяцкай канфесіі ў Беларусі.

Грэка-Каталіцкая Царква, якая ў канцы XVIII ст. колькасна дамінавала ў Беларусі (аб'ядноўвала каля 80% беларусаў), аказала значны ўплыў на яе рэлігійнае і нацыянальна-культурнае аблічча, дала найцікавыя ўзоры жывапісу, скульптуры, дойлідства, сёння нешматлікая – 16 парафій, 5000 вернікаў, згодна з афіцыйнымі дадзенымі. Царква цалкам беларускамоўная і сваім вернікам дае адчуванне беларускасці. Увядзенне нацыянальнай мовы ў літургію стала яе ўкладам у адраджэнне беларускай культуры. Досвед адраджэння Грэка-Каталіцкай Царквы засведчыў, што перадаваная праз пакаленні гістарычная памяць з'яўляецца магутнай сілай. Сучасная Царква – паўнапраўны доўгажыхар Беларусі. Сваёй гістарычнай місіяй яна лічыць працягваць 400-гадовую традыцыю маста паміж хрысціянскім Усходам і Захадам.

## Высновы

Тое, што ў часы Вялікага Княства Літоўскага Баруны былі важным рэлігійным і адукацыйным асяродкам Уніяцкай Царквы і тут захаваўся прыгожы барочны комплекс былога базылянскага манастыра з іконай Маці Божай Барунскай, якая лічыцца цудатворнай, сёння гэта вызначае высокі гісторыка-культурны і духоўна-рэлігійны статус мястэчка, яго турыстычную і паломніцкую прывабнасць. Барунскія рэліквіі, напоўненыя эмацыйным, эстэтычным і духоўным сэнсамі, жывуць адначасова і ў гістарычнай, і ў рэальнай прасторы. Яны перадаюць нам памяць вякоў і пакаленняў. Хада часу ўзмацняе іх каштоўнасць.

Можна гаварыць пра дваякага роду "месца памяці" Баруны. Гэта і ўласна гістарычныя артэфакты, і памяць-рэпрэзентацыя, увасобленая ў мемуарах і паэмах, царкоўных святах і юбілейных урачыстасцях, у шанаванні іконы з трохсотгадовай гісторыяй і творах мастацтва (ад малюнка "Баруны" Напалеона Орды да сучаснай копіі іконы мастачкі Ядвігі Сенько), у "Алеі Асветніцтва" і "Падарожжы Жыгамонта", у лічбавых рэсурсах (сайты "Грэка-католікі Беларусі", "Catholic.by") і інш. Памяць пра адукацыйна-культурна-рэлігійны асяродак Баруны падтрымліваюць, пашыраюць і ўзбагачаюць яго даследчыкі – гісторыкі, мастацтвазнаўцы, краяведы; папулярызуюць журналісты; актуалізуюць святары і культавыя інстытуты, якія выступаюць у ролі дзейсных актараў палітыкі памяці. Сучасная рэпрэзентацыя духоўна-культурнай спадчыны Барунаў уздымае гістарычны прэстыж Ашмянскага краю, Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы, Рыма-Каталіцкай царквы Беларусі ў вачах беларусаў і суседніх народаў і важная для фарміравання "новай" беларускай ідэнтычнасці.

## Спіс літаратуры

*Boruny*. (1880). W: *Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich*. Warszawa: nakł. F. Sulimierskiego i W. Walewskiego, t. 1, c. 330–331.

Chodźko, I. (1925). *Boruny*. Warszawa: Gebethner i Wolff.

Chomik, P. (2003). *Boruńska Ikona Matki Bożej*. W: Chomik, P. *Kult Ikon Matki Bożej w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI–XVIII wieku*. Białystok: Wydział Historyczno-Socjologiczny Uniwersytetu w Białymstoku, c. 118–131.

Kiszka, L. (1712). *Morze Łask y szczodrobliwości Boskich w Puszczy Boruńskiey plynące to jest cuda Naysw. Panny Boruńskiey w Borunach doznane*. Supraśl.

Kiszka, L. (2009). *Morze Łask, y szczodrobliwośći Boskich, w Puszczy Boruńskiey płynące: To iest Cuda Nayśw: Panny Boruńskiey w Borunách doznane*. [Мінск].

Wereda, D. (2006). *Z dziejów sanktuarium i placówki oświatowej w Borunach.* "Nasza Przeszłość", t. 105, c. 189–206.

Адынец, А. (2020). *Успаміны пра мінулае*. Мінск: Лімарыус.

Бітэль, П. (1990). *Баруны*. У: Бітэль, П. (1990). *Дзве вайны: Верш, аповесці*. Мінск: Мастацкая літаратура, с. 145–187.

Бітэль, П. (1991). *Баруны*. "Голас Радзімы", 31 кастрычніка.

Бражыцкая, А. (2017). *Алея Асветніцтва ў Барунах*. https://nastgaz.by/aleya-asvetnitstva-u-barunah/ (08. 09. 2024).

Дамброўскі, Л. (2007). *Санктуарыум Маці Божай Барунскай*. [Б. м.: б. в.].
Доўнар, А. (2007). *Прывілей на магдэбургскае права мястэчку Баруны 1705 г.* У: *Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына*. Мінск, с. 103–108.
Калевіч, Г. (1991). *Цудоўная Маці з бору*. “Наша вера”, № 1 (7). https://media.catholic.by/nv/n7/art20.htm (10. 02. 2024).
Козел, Л. (2018). *Барунская школа. Найстарэйшай навучальнай установе краіны споўнілася 400 год*. “Ашмянскі веснік”, 1.02. https://www.osh.by/?p=39480 (08. 09. 2024).
Марозава, С. (2014). *Барунская базыльянская школа і яе выхаванцы*. W: *Klasztory mnisze na wschodnich terenach dawnej Rzeczypospolitej od XVI do początków XX wieku*. Poznań: Wydawnictwo Nauka i Innowacji, s. 339–354.
Марозава, С., Марозаў, С. (2023). *Культурная спадчына Уніяцкай Царквы Беларусі (1596–1839 г.)*. Гродна: ЮрСаПрынт.
*“Падарожжа дылетанта” распавядае пра касцёл і цудадзейны абраз у Барунах. (2017).* https://catholic.by/3/news/belarus/1956-padarozhzha-dyletanta-raspavyadae-pra-kastsjol-i-tsudadzejny-abraz-u-barunakh (08. 09. 2024).
Падчас урачыстасці. (2023). *Падчас урачыстасці ў Барунах біскуп Кашкевіч абвясціў аб будучай каранацыі цудадзейнага абраза Маці Божай Барунскай* (20.10.2023). https://catholic.by/3/news/belarus/16452-padchas-urachystastsi-barunakh-biskup-kashkevich-abvyastsi-ab-karanatsyi-tsudadzejnaga-abraza-matsi-bozhaj-barunskaj (08. 09. 2024).
Палуцкая, С. (1995). *Барунская базыльянская школа і яе выхаванцы*. У: *Ашмяншчына: Гісторыя і сучаснасць*. Гродна – Ашмяны, с. 25–34.
Пашкевич, М. (1907). *Чудотворная икона Богородицы в Борунах: с краткими сведениями о монастыре и училище*. Вильна: Типография “Русский почин”.
*Правінцыйны аддзел. Баруны* (1921). “Наша думка”, 18 сакавіка.
Самусік, А. (1998). *Дзейнасць манаскіх ордэнаў ў галіне асветы на Беларусі ў першай трэці XIX ст.* “Гісторыя: праблемы выкладання”, № 1, с. 37–46.
Стрэнкоўскі, С. (2016). *Магдэбургскае самакіраванне мястэчка Баруны*. “Вестник МГИРО”, № 4, с. 59–66.
У Барунах. (2022). *У Барунах з удзелам біскупаў адзначылі юбілей 100-годдзя вяртання цудадзейнага абраза Маці Божай Суцяшальніцы засмучаных* (17.10.2022). https://catholic.by/3/news/belarus/15121-u-barunakh-z-udzelam-biskupau-adznachyli-yubilej-100-goddzya-vyartannya-tsudadzejnaga-abraza-matsi-bozhaj-sutsyashalnitsy-zasmuchanykh (08. 09. 2024).
Чавус, С. (2020а). *Гравюры з выявай Маці Божай Барунскай як крыніца іканаграфіі абраза*. “Беларускі гістарычны часопіс”, № 9, с. 13–21.
Чавус, С. (2020б). *Спісы абраза Маці Божай Барунскай як сведчанне папулярнасці яго культу*. “Беларускі гістарычны часопіс”, № 12, с. 15–23.
Шпунт, А. (2023). *Апостал уніі*. “Наша вера”, № 1, с. 24–25.
Ярашэвіч, А. (2015). *Барунскі абраз Маці Божай: гісторыя, іканаграфія, арэал шанавання*. У: Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён. Мінск: Беларуская навука, с. 363–371.

[Adynec, A. (2020). *Uspamìny pra mìnulae*. Mìnsk: Lìmaryus.
Ârašèvič, A. (2015). *Barunski abraz Maci Božaj: gistoryâ, ikanagrafiâ, arèal šanavannâ*. U: Belarus′ praz pryzmu règìânal′naj gìstoryì: Ašmâny ì Ašmânskì règìën. Mìnsk: Belaruskaâ navuka, c. 363–371.
Bìtèl′, P. (1990). *Baruny*. U: Bìtèl′, P. (1990). *Dzve vajny: Verš, apovescì*. Mìnsk: Mastackaâ lìtaratura, c. 145–187.
Bìtèl′, P. (1991). *Baruny*. "Golas Radzìmy", 31 kastryčnìka.
Bražyckaâ, A. (2017). *Aleâ Asvetnìctva ŭ Barunah*. https://nastgaz.by/aleya-asvetnitstva-u-barunah/ (8.09.2024).
Čavus, S. (2020a). *Gravûry z vyâvaj Macì Božaj Barunskaj âk krynìca ìkanagrafìì abraza*. "Belaruskì gìstaryčny časopìs", № 9, c. 13–21.
Čavus, S. (2020b). *Spìsy abraza Macì Božaj Barunskaj âk svedčanne papulârnascì âgo kul′tu*. "Belaruskì gìstaryčny časopìs", № 12, c. 15–23.
Dambroŭskì, L. (2007). *Sanktuaryum Macì Božaj Barunskaj*. [B. m.: b. v].
Doŭnar, A. (2007). *Pryvìlej na magdèburgskae prava mâstèčku Baruny 1705 g.* W: Âgelony: dynastyâ, èpoha, spadčyna. Mìnsk, c. 103–108.
Kalevìč, G. (1991). *Cudoŭnaâ Macì z boru*. "Naša vera", № 1 (7). https://media.catholic.by/nv/n7/art20.htm (08. 09. 2024).
Kozel, L. (2018). *Barunskaâ škola. Najstarèjšaj navučal′naj ustanove kraìny spoŭnìlasâ 400 god.* "Ašmânskì vesnìk", 1.02. https://www.osh.by/?p=39480 (08. 09. 2024).
Marozava, S. (2014). *Barunskaâ bazyl′ânskaâ škola ì âe vyhavancy*. W: *Klasztory mnisze na wschodnich terenach dawnej Rzeczypospolitej od XVI do początków XX wieku*. Poznań: Wydawnictwo Nauka i Innowacji, 2014, c. 339–354.
Marozava, S., Marozaŭ, S. (2023). *Kul′turnaâ spadčyna Unìâckaj Carkvy Belarusì (1596–1839 g.)*. Grodna: ЮрсаПрынт.
*"Padarožža dyletanta" raspavâdae pra kascël ì cudadzejny abraz u Barunah*. (2017). https://catholic.by/3/news/belarus/1956-padarozhzha-dyletanta-raspavyadae-pra-kastsjol-i-tsudadzejny-abraz-u-barunakh (10. 02. 2024).
*Padčas uračystascì. (2023). Padčas uračystascì ŭ Barunah bìskup Kaškevìč abvâscìŭ ab budučaj karanacyì cudadzejnaga abraza Macì Božaj Barunskaj* (20.10.2023). https://catholic.by/3/news/belarus/16452-padchas-urachystastsi-barunakh-biskup-kashkevich-abvyastsi-ab-karanatsyi-tsudadzejnaga-abraza-matsi-bozhaj-barunskaj (08. 09. 2024).
Paluckaâ, S. (1995). *Barunskaâ bazyl′ânskaâ škola ì âe vyhavancy*. u: Ašmânščyna: Gìstoryâ ì sučasnasc′. Grodna – Ašmâny, c. 25–34.
Paškevič, M. (1907). *Čudotvornaâ ikona Bogorodicy v Borunah*: s kratkimi svedeniâmi o monastyre i učiliŝe. Vil′na: Tipografiâ "Russkij počin".
*Pravincyjny addzel. Baruny* (1921). "Naša dumka", 18 sakavika.
Samusìk, A. (1998). *Dzejnasc′ manaskìh ordènaŭ ŭ galìne asvety na Belarusì ŭ peršaj trècì XIX st*. "Gìstoryâ: prablemy vykladannâ", № 1, c. 37–46.
Špunt, A. (2023). *Apostal unii*. "Naša vera", № 1, c. 24–25.
Strènkoŭskì, S. (2016). *Magdèburgskae samakìravanne mâstèčka Baruny*. "Vestnik MGIRO", № 4, c. 59–66.

U Barunah. (2022). *U Barunah z udzelam bìskupaŭ adznačylì ûbìlej 100-goddzâ vârtannâ cudadzejnaga abraza Macì Božaj Sucâšal'nìcy zasmučanyh* (17.10.2022). https://catholic.by/3/news/belarus/15121-u-barunakh-z-udzelam-biskupau-adznachyli-yubilej-100-goddzya-vyartannya-tsudadzejnaga-abraza-matsi-bozhaj-sutsyashalnitsy-zasmuchanykh (08. 09. 2024).]

■ **Siarhei Marozau** – Ph.D. in History (2016), Associate Professor (2019), independent researcher (Grodno, Belarus). Research interests: the Grand Duchy of Lithuania in the memory politics of the Republic of Belarus. After 10 years teaching experience (2010–2020) at Yanka Kupala State University of Grodno was forced to resign due to political persecution during the political crisis in Belarus in autumn 2020 and received ban on the profession. Research activities since 2000. Conducted scientific research in major libraries and archives of Belarus, Lithuania, Poland, Russia. Author of 70 scientific publications, including 5 books (2 co-authored).